


Анатолій Маркевіч і Яўген Курчыч

# За папулярызацыю культуры

**У Міністэрстве культуры ўшанавалі членаў рэжысёрска-пастановачнай групы патрыятычнага форуму "Гэта НАША гісторыя!".**

Грандыёзны праект, прысвечаны Дню народнага адзінства, адбыўся 17 верасня ў "Мінск-Арэне". У яго падрыхтоўцы прынялі ўдзел сапраўдныя майстры сваёй справы, за плячыма якіх шэраг маштабных культурных падзей.

За добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і значны асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай культуры былі ўзнагароджаны 16 чалавек.

Нагрудны знак "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" атрымалі галоўны рэжысёр Агата Мацко, рэжысёр-пастаноўшчык Яна Калачынская, гукарэжысёр філіяла "Каладзішчанскі культурна-спартыўны цэнтр" Мінскага раённага цэнтра культуры Дзяніс Вяршэнка і старшыя выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Яўген Курчыч, Вольга Наўроцкая і Яўген Чарнышоў.

Таксама міністр культуры Анатолій Маркевіч уручыў Ганаровыя граматы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і павіншаваў узнагароджаных, пажадаўшы ім новых творчых поспехаў у працы.